УДК 375.3/5 : 821.09

# ВЫВУЧЭННЕ СТЫЛЮ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ШКОЛЕ

**Клопава Данута Вацлаваўна**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа №1 г.п. Бялынічы імя М. І. Пашкоўскага"
( г. Бялынічы, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Увагу прыцягвае той твор і яго аўтар, які добра засвоіў выпрацаваныя класікамі крытэрыі мастацкасці. Дзеля вырашэння мастацкіх задач сучасныя празаікі, паэты, драматургі актыўна ўдасканальваюць традыцыйныя формы і ствараюць новыя жанравыя разнавіднасці. Для мастацкай літаратуры апошніх 20-ці гадоў характэрны ўніверсальнае спалучэнне разнастайных ідэйна-філасофскіх і эстэтычных плыняў, максімальна шырокі ідэйна-тэматычны ахоп шматлікіх сучасных праблем [2; 4; 5; 6; 7; 8].

Жанр аповесці ў сучасных умовах стаў найбольш запатрабаванай мастацкай формай, праз якую можна ўдала пераплавіць усю гаму чалавечых эмоцый, пачуццяў, перажыванняў і мар дзеля вызначэння магчымых шляхоў вырашэння наспелых праблем і канфліктаў эпохі. Такі характар спасціжэння рэчаіснасці назіраецца ў аповесцях апошніх двух дзесяцігоддзяў такіх празаікаў, як А. Федарэнка, У. Саламаха, Г. Марчук, В. Шырко, М. Карпечанка [11]. Іх аповесці пранізвае жаданне стварыць свой, найбольш прыдатны для творчай індывідуальнасці, стыль пісьменніка, які б стаў сапраўдным прарывам у мастацкай літаратуры, каб зрабіць чалавека неад'емнай часткай сусветнага працэсу развіцця, не прыніжаючы і не завышаючы яго ролі ў жыццёвай самарэалізацыі. Мова і стыль іх твораў ярка акрэсліваецца праз майстэрства пейзажу, дыялога, партрэта.

Надзвычай хуткімі тэмпамі развіваюцца малыя эпічныя формы – навела і апавяданне [8; 9; 10; 11]. Асаблівае месца ў літаратуры займаюць інтэлектуальныя аповесці, апавяданні, навелы Андрэя Федарэнкі: "Падслу-

ханая казка”, “Афганская шкатулка”, “Пеля”. Яго творы змяшчаюць у сабе чароўныя пейзажныя малюнкі роднай Беларусі. Намаляваная словам карціна выглядае як бы застылай на палатне, выклікаючы ў душы чытача настрой мірнай задаволенасці. Паводле разваг пісьменніка, родная зямля не толькі вабіць і прыцягвае чалавека, але і абараняе яго праз усё жыццё, выратоўвае ад выпадковай згубы, служыць зарукай выжывання.

У цыкле навел, аб’яднаных агульнай назвай “Хай людзі бачаць”, Васіль Шырко ў мастацкай форме прадставіў уласную філасофію народнага жыцця, заснаваную на глыбокай павазе да чалавека працы, на шанаванні нацыянальнай культуры і традыцый, на беражлівым стаўленні да прыроды і навакольнага асяроддзя. У творы шмат карнавальных сцэн, жартаўлівых сюжэтаў, дасціпных жартаў, анекдотаў, народнага гумару як крыніцы жыццёвай энергіі.

Вялікі набытак сучаснай літаратуры – казкі, апавяданні і навелы Георгія Марчука. Малыя літаратурныя формы аўтара тэматычна і стылёва шматпланавыя. Яго філасофскія казкі і апавяданні ўспрымаюцца як працяг славутых “Казак жыцця” Якуба Коласа. У апавяданні “На беразе Гарыні” арганічна спалучаюцца ўспаміны дзяцінства і прыгодніцкі сюжэт, трагічнае і камічнае, сур’ёзнае і пацешнае.

Звяртае на сябе ўвагу мова твораў Міхася Карпечанкі. З самага пачатку творчага шляху аўтар твораў “Кола маны”, “Бутэлька”, “Ірына”, “Іржа”, “Дачка волі” клапоціцца аб якасці слова, адбірае ў дыялогах словы, якія з найбольшай сілай выяўляюць адметнасць чалавечага характару. Многія старонкі аповесцяў застаюцца ў памяці, уражваюць глыбокім псіхалагізмам [1].

Вялікую прыцягальную сілу маюць творы беларускай дзіцячай літаратуры [2; 4; 10]. Вызначальным з’яўляецца такі напрамак, як “экалагічная казка”. Выйшла “Чырвоная кніга ў казках і вершах беларускіх пісьменнікаў”. Поруч з Віктарам Гардзеем рушылі ў захапляльны свет жывой прыроды Віктар Праўдзін, Людміла Рублеўская, Яўген Хвалей, Віктар Шніп. У кнізе можна пазнаёміцца са звесткамі з Чырвонай кнігі і з мастацкім творам – казкай або вершам – створанымі на падставе гэтых звестак. Новая экалагічная казка можа стаць яскравым літаратурным брэндам краіны.

Пісьменнікі, як правіла, абапіраюцца на ўласны жыццёвы досвед, шмат чэрпаюць з гістарычных рэалій, а таксама звяртаюцца да фальклору, народных легенд, паданняў і казак, часта выкарыстоўваюць элементы народнай карнавальнай культуры, анекдатычныя гісторыі, запазычваюць і апрацоўваюць універсальныя сюжэты. Увага мастакоў слова звычайна канцэнтруецца на яркім дзеянні, адметным факце. Яны засяроджваюцца на ўнутраным стане персанажаў, прасочваюць зрухі ў душы герояў. Сучасныя беларускія аповесці і апавяданні абапіраюцца на эстэтычныя здабыткі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

папярэдніх эпох і стыляў, прычым у іх істотна ўзмацніліся рэфлексіўнасць, псіхалагізм і трагедыйнасць [10].

Такім чынам, жанравыя вынаходніцтвы, творчыя ўдасканаленні і смелыя мастацка-вобразныя эксперыменты дазваляюць пісьменнікам паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы, даносіць да чытача ўласныя мастацкія здабыткі, ствараць свой стыль. У сувязі з адзначаным вывучэнне стылю мастацкай літаратуры ў школе ўяўляецца актуальным, важным, неабходным.

**Літаратура**


1. Карпечанка, М. А. Іржа / М. Карпечанка. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. – 236 с.
2. Беларуская літаратура : дапам. для вучняў 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.] ; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009.
3. Бельскі, А. Класікі і сучаснікі ў школе : дапам. для настаўнікаў / А. Бельскі. – Мінск, 2005.
4. Бельскі, А. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў / А. Бельскі. – Мінск, 2000.
5. Гісторыя беларускай літаратуры: Частка 2 : сучасны перыяд (1986– 2006) : вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. Д 21 05 01 “Беларус. філалогія” / скл. А. І. Бельскі. – Мінск : БДУ, 2007. – 17 с.
6. Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі : артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў / У. Гніламёдаў, – Мінск : Маст. літ., 1987. – 288 с.
7. Кісліцына, Г. Пошукі новых камунікатыўных сродкаў у мастацкай літаратуры XXI стагоддзя / Ганна Кісліцына // Полымя. – 2015. – № 2. – С. 142–146.
8. Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура XX ст. : вучэбны дапаможнік / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск : Выш. шк., 2001. – 352 с.
9. Не размінуцца з атлантыдай класікі : “круглы стол” па выніках акцыі “Топ-10 любімых твораў беларускай класікі” / [аўтар прадмовы] Юлія Алейчанка // Полымя. – 2015. – № 3. – С. 154–169.
10. Саверчанка, І. Сінкрэтызм як мастацкі стыль і эпоха / Іван Саверчанка // Полымя. – 2016. – № 3. – С. 133–143.
11. Шаладонаў, І. Сучасная аповесць : чалавек і час / Ігар Шаладонаў // Полымя. – 2016. – № 10. – С. 130–146.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова